# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*2023 год*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**9 клас**
**Варыянт 2**

**Заданне 1.**

| **Часціны мовы, да якіх належаць амаформы** | **Словазлучэнні (сказы), якія ілюструюць лексічнае значэнне амаформаў (прыкладныя варыянты)** | **Падзел на марфемы** |
|---|---|---|
| *разліў* – назоўнік | *вясенні разліў* | *раз-лі-ў* (прыстаўка, корань, суфікс, нулявы суфікс, нулявы канчатак) |
| *разліў* – дзеяслоў | *разліў малако* | *раз-лі-ў* (прыстаўка, корань, суфікс, нулявы канчатак) |
| | | |
| *піла* – назоўнік | *вострая піла* | *піл-а* (корань, канчатак) |
| *піла* – дзеяслоў | *піла ваду* | *пі-л-а* (корань, суфікс, канчатак) |
| | | |
| *сталі* – назоўнік (р. скл.) | *вырабы са сталі* | *стал-і* (корань, канчатак) |
| *сталі* – дзеяслоў | *сталі на ногі* | *ста-л-і* (корань, суфікс, канчатак) |
| | | |
| *палкі* – назоўнік (мн. л. / адз. л., р. скл.) | *дубовыя палкі*; *няма палкі* | *палк-і* (корань, канчатак) |
| *палкі* – прыметнік | *палкі юнак* | *пал-к-і* (корань, суфікс, канчатак) |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,25 бала.*

***Заўвага! У адпаведнасці з прапанаванымі словамі могуць прыводзіцца іншыя прыклады амаформаў, напрыклад:*** *калі (дзеяслоў) – калі (прыслоўе), калі (дзеяслоў) – калі (злучнік)*. ***Галоўнае патрабаванне – наяўнасць амаформы (не лексічнага амоніма, не амографа, не амафона)!***

**Заданне 2.**

| Фразеалагізм | Значэнне | Кампанент | + |
|---|---|---|---|
| *трымаць вышэй ...* | ‘пераставаць сумаваць, адчайвацца, паводзячы сябе горда, з пачуццём уласнай годнасці’ | *плечы* | |
| | | *нос* | |
| | | *галаву* | + |
| | | *хвост* | |
| | | *чало* | |
| *слацца ...* | ‘лісліва дагаджаць каму-н., падлізвацца да каго-н.’ | *лістам* | + |
| | | *коўдрай* | |
| | | *прасцінай* | |
| | | *абрусам* | |
| | | *прасціradлам* | |
| *не лезе па слова ў ...* | ‘ведае, што сказаць, як адказаць; знаходлівы, дасціпны ў размове’ | *слоўнік* | |
| | | *кнігу* | |
| | | *галаву* | |
| | | *розум* | |
| | | *кішэню* | + |
| *спусціўшы ...* | ‘без належнай стараннасці, абы-як (рабіць што-н.)’ | *рукі* | |
| | | *рукавы* | + |
| | | *нос* | |
| | | *галаву* | |
| | | *пояс* | |
| *цягнуць за ...* | ‘усяляк дапамагаць няздольнаму, няўмеламу чалавеку ў вучобе, у руху па службе і пад.’ | *каўнер* | |
| | | *рукаў* | |
| | | *вушы* | + |
| | | *валасы* | |
| | | *руку* | |
| *страляць з (са) ... па вераб’ях* | ‘траціць шмат сіл, сродкаў на дробязі’ | *ружжа* | |
| | | *стрэльбы* | |
| | | *лука* | |
| | | *гарматы* | + |
| | | *кулямёта* | |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| Склон і лік | Словы | Граматычныя формы |
|---|---|---|
| Родны, множны | *ступень* | ***ступеней / ступеняў*** |
| Давальны, адзіночны | *ваявода* | – |
| Творны | *дзверы* | ***дзвярамі / дзвярыма / дзвярмі*** |
| Месны | *гарох* | ***гароху / гаросе*** |
| Месны, адзіночны | *сад* | – |
| Родны, множны | *якасць* | – |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| **Слова з тэксту** | **Лексіка-граматычная і граматычная характарыстыка** | **Выпраўленне памылкі (пры яе наяўнасці)** | **Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці)** |
|---|---|---|---|
| *апетыя*[1] | Дзеепрыметнік: залежнага стану, закончанага трывання | Правільна | – |
| *іншых*[2] | Прыметнік: адносны, у форме меснага склону | *Іншых* – гэта займеннік | Слова *іншых* адносіцца да разраду азначальных займеннікаў |
| *калі*[3] | Прыслоўе: часу, невытворнае | *Калі* – гэта падпарадкавальны злучнік | Слова *калі* ў прыведзеным сказе з’яўляецца злучнікам, паколькі мае значэнне ўмовы, не з’яўляецца членам сказа |
| *ўжо*[4] | Часціца: вытворная, сэнсавая | *Ужо* – гэта прыслоўе | Слова *ўжо* ў прыведзеным кантэксце з’яўляецца прыслоўем, таму што мае значэнне ‘зараз, цяпер’ |
| *хачу*[5] | Дзеяслоў: абвеснага ладу, I спражэння | Дзеяслоў *хачу* рознаспрагальны | *Я хач-у*<br>*Ты хоч-аш*<br>*Ён (яна, яно) хоч-а*<br>*Мы хоч-ам*<br>*Вы хоч-аце*<br>*Яны хоч-уць*<br>Дзеяслоў *хацець* рознаспрагальны, паколькі мае канчаткі I-га (у 3-й асобе мн. л.) і II-га (у астатніх формах) спражэння |
| *наколькі*[6] | Займеннік: адносны, суадносны з лічэбнікам | *Наколькі* – гэта прыслоўе | Слова *наколькі* з’яўляецца прыслоўем, выступае ў сказе ў ролі злучальнага слова. У якасці займенніка гэта слова наогул не ўжываецца |

*За кожны правільны радок – 1 бал (0,5 бала за выпраўленне памылкі і 0,5 бала за яе тлумачэнне або 1 бал за сцвярджэнне правільнасці ў адпаведным прыкладзе).*

***Заўвага! Магчымыя іншыя правільныя тлумачэнні дапушчаных памылак.***

**Заданне 5.**

| **Слоўнікавы артыкул** | **З якога слоўніка ўзяты артыкул?** |
|---|---|
| АРХІДЭЯ. Буйная шматгадовая наземная літафітная або эпіфітная травяністая расліна з духмянымі кветкамі з сямейства аднадольных. | тлумачальны / тэрміналагічны (батанічны) |
| АРХІДЭЯ. Запаз. з грэч. *orchidion* (ядзерка). | слоўнік запазычаных слоў / этымалагічны (слоўнік паходжання слоў) |
| АРХІДЭЯ. корань – *-архідэй-*, канчатак – *-а*; аснова слова – *архідэй-*. | марфемны |
| АРХ**І**ДЭ́Я *ж.* арх**і**дэ́я, *РДМ* арх**і**дэ́і, арх**і**дэ́ю, арх**і**дэ́яй (-яю); *мн. НВ* арх**і**дэ́і, арх**і**дэ́й, арх**і**дэ́ям, арх**і**дэ́ямі, арх**і**дэ́ях. | граматычны / арфаграфічны / Слоўнік беларускай мовы |

**Агульная задача (варыянт адказу):** Прывядзенне цэлай сукупнасці звестак пра словы, што выклікаюць пэўныя цяжкасці ў напісанні, вырашае задачу забеспячэння гэтых слоў такім гісторыка-лінгвістычным каментарыем, які павышае правапісную кампетэнтнасць носьбітаў мовы, паколькі веданне паходжання і асаблівасцей адаптацыі таго ці іншага запазычанага слова да сістэмы беларускай мовы робяць празрыстай яго ўнутраную структуру, якая можа абумоўліваць пэўныя нюансы напісання адпаведнай лексічнай адзінкі.

*За кожнае правільнае вызначэнне слоўніка – 1 бал, за прынцыпова правільнае вызначэнне агульнай задачы – 1 бал.*

**Заданне 6.**

Формула правільная для сказаў **1**, **3**, **4**, **6**.

*За кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці / непраўдзівасці формулы – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Экалагічны турызм прадугледжвае *(мае на ўвазе, заснаваны на)* выкарыстанне рэсурсаў натуральнага прыроднага асяроддзя (помнікаў прыроды і прыродных славутасцей *(выдатнасцей, выдатных мясцін)*) для арганізацыі шырокага спектру падарожжаў – ад невялікіх пазнавальных тураў для школьнікаў да рэгулярных турысцкіх праграм у нацыянальных парках і запаведніках. Ён паказвае важнасць аховы навакольнага асяроддзя. Прыбытак, які атрымліваюць турфірмы *(атрымліваецца турфірмамі)*, можа часткова накіроўвацца на прыродаахоўныя мерапрыемствы.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| | Лішняе слова | Памер | Тып рыфмоўкі |
|---|---|---|---|
| А | хутка | 4-стопны амфібрахій | перакрыжаваная |
| Б | белы | 6-стопны ямб | апаясная / кальцавая |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 1 бал.*

**Заданне 9.**

| | Хто звяртаецца | Да каго звяртаецца | Назва твора | Аўтар твора |
|---|---|---|---|---|
| А | Маці | Дарогі | “Маці” | Аркадзь Куляшоў |
| Б | Жонка Грынкевіча | Горава | “Паром на бурнай рацэ” / “Нельга забыць” | Уладзімір Караткевіч |
| В | Мульцік | Гастрыта | “Вечар” | Аляксей Дудараў |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

Імя пісьменніка: Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

*За правільна вызначанае імя – 0,5 бала, за кожнае правільна вызначанае месца – 0,5 бала, за беспамылковае вызначэнне аб’ектаў агляду ў кожным месцы – 1 бал, за часткова правільнае вызначэнне аб’ектаў агляду – 0,5 бала.*

*Рэклама ацэньваецца наступным чынам:*

| | |
|---|---|
| *1 бал* | *Тэкст мае адрасны характар (для вучняў старшых класаў), эфектыўны з пункту погляду мэты (пабуджае падарожнічаць па прапанаваным маршруце), вытрыманы стылёва.* |
| *0,5 бала* | *Тэкст або не мае адраснасці, або не з’яўляецца эфектыўным з пункту погляду мэты (не пабуджае падарожнічаць па прапанаваным маршруце), або стылёва не вытрыманы.* |
| *0 балаў* | *У тэксце адсутнічаюць або 2, або 3 з прапанаваных вышэй кампанентаў* |